

## ГЕНАДЗЬ ГОВАР

*Нарадзіўся ў 1945 г. у г. Жлобіне.*

*Вучыўся ў Мінскай і Каўнаскай мастацкіх вучэльнях.*

*Сябра Саюза мастакоў РБ.*

*Мае шматлікія публікацыі ў перыядычным друку.*

*Выйшлі зборнікі паэзіі «Мае абпаленыя крылы» (1998 г.), «Мой нечаканы вершапад» (2000 г.), паэма «Князь-возера» (2002 г.).*

# *Вербная Нядзеля*

* * *

Бессаромна дарыце
Любоў!
І на Вас ніхто
Не пакрыўдзіцца...
Няхай коціцца роспач
Далоў,
А зласлівасць няхай
Абанкруціцца...
Ад любові да веры –
Крок.
Крок галоўны, бо ён
Сусветны...
Ад любові знікае
Змрок –
Адкрываецца шлях
Запаветны.

* * *

Сонная водмель.
Забалаць.
Ноч. Купалле. Вянкі
Па рацэ…
Ён. Яна. Яго кветка –
Папараць,
Яе пальцы ў ягонай
Руцэ…
Запалала свяча
Зіхатлівая…
Загарэлася вогнішча
У печы…
Ўвачавідкі краса
Сарамлівая:
Ногі стройныя,
Белыя плечы…
Час імклівы каханнем
Асветлены,
Шчасцем поўняцца вочы
Каханых…
Дагарае агарак
Аплаўлены.

* * *

Адвечныя Палесся далягляды
Вабяць апантаных мастакоў:
Ўвосень залатую, на Каляды,
Ўвесну трапяткую… Зноў і зноў…

Неба жураўлінае… Паветра…
Сенажаці з водарам п'янкім…
Снег блакітны… Пешкі кіламетры…
Праз вясёлак аркі – напрамкі.

… А эцюднік, палатно і фарбы,
Як заўжды, адданыя натхненню,
Чараўнічыя Палесся скарбы
Зіхацяць насустрач летуценню…

* * *

Варожыць дзяўчо
На рамонку…
Ці кахае каханы
Сяброўку?!
Пялёсткі белыя
Абрывае…
Вачамі сінімі
Абмывае…
Варожыць дзяўчо
На рамонку…
Не верыцца.
Зноўку і зноўку…

* * *

*Наталлі Малашэнка*
*на дзень нараджэння*

Няма жывога колеру ў зімы.
Навокал снег, нібы вялізны саван,
І сонны лес, пажухлы і нямы,
Не цягне да сябе… Шчымліва ява…
Няма жыцця і толькі шэрань пылу
Яднае дрэвы ў брудную сцяну.
Бязколернасць схіліла да капылу
Бярозу, дуб, яліну і сасну…
Няма жывога колеру, які
Прывабіў бы, дзеля пацехі дзеля…
Аж не, вунь ружавеюць лазнякі –
Не за гарамі Вербная Нядзеля!